*УДК 378:004.738.5*

## ТРАНСПОРЕНТНОЕ ОБРАЗОВАНИЕ

**В.В. Лемех**
*Институт повышения квалификации и переподготовки кадров АПК Белорусского государственного аграрного университета*
*Минск, Беларусь*

***Идея:*** *деколлективизация вертикально-организованных компаний при посредничестве Интернет.*
***Элементы новизны:*** *освобождение интеллектуальной собственности преподавателей и слушателей от наемного труда.*
***Практические предложения:*** *разработка Интернет-ресурсов со сверхфункциональными возможностями.*

### 1. Замкненасць як праблема і непазбежнасць

Генеральная стратэгія, закладзеная прыродай, заснавана на падзелу зон уплыву. Падзел на "сваіх-чужых" стасуецца са структурай замкненага асяроддзя, дактрынай жыцця навязанага эканомікай. Эканоміка падзяляе, вычляняе функцыянальнае, надае звышактуальнасць працоўнаму часу, яго добравядомай прыстасаванасці да калектывізацыі. Адукацыя, якая падпадае пад уладу эканомікі губляе ініцыятыву, ператвараецца ў спецыялізаванае прадпрыемства, амбіцыі каторага не выходзяць далей вытворчасці, размеркавання, удасканальвання і замены працоўнага рэсурса эканомікі. Выключна рацыянальная місія міністэрскай адукацыі стварае прэцыдэнт колькасна арыянтаванага школьнага, студэнцкага і дарослага навучання. Паміж адукацыяй, з аднаго боку, і яе эканамічным вобразам, з другога, узнікае вялікая адлегласць. Гэта адлегласць паміж якасцю і колькасцю. Эканоміка стаіць на баку колькасці, скарыстоўваючы падаткавыя рэсурсы для фінансавання калектыўнай занятасці школьнікаў, студэнта• і дарослых кадраў. Але есць адна праблема. Вядома, што кватэра нават з выдатнай цеплаізаляцый з цягам часу губляе цяпло. Дысіпацыя цяпла робіць замкненасць тэрыторыі небездакорнай, адноснай і рызыкоўнай. Нават пры самым кампетэнтным кіраванні калектыўнай занятасцю застаецца тое, што нясе пагрозу замкненай правінцыяльнасці: гэта вольны час, які знаходзіць прытулак у сям'і. Незалежна ад амбіцый кіруючай бюракратыі адукацыя застаецца ўмоўна замкненай. Значная частка якаснай інфармацыі не знаходзіць месца ў асяроддзі рэгламентаванай працоўнай занятасці штатных адзінак. Кадравы прынцып адукацыі пры ўсей жорсткасці эканамічнага і адміністратыўнага ціску пакідае сям'ю і прытулак для вольнага часу. Сям'я, як лыжка дзегця псуе "бездакорную" логіку калектыўнай працы. Па сцэнару вузкапрагматычнай кадравай палітыкі студэнская адукацыя стварае прэцыдэнт "працоўнай кніжкі", тады як дарослы кадр выкарыстоўвае адукацыю для пашырэння сваіх працоўных амбіцый. Адукацыя, ўцягнутая ў праблему эксплуатацыі і замены кадраў, штучна звужае культурнае асяроддзе да ўзроўня рэгламентаванай працоўнай занятасці. У народзе гэта называецца атрымаць "корку". Бюракратычны кантроль за выдачай, размеркаваннем і заменай "корак"служыць сведкам таго, што адукацыя застаецца ў палоне кадравай палітыкі эканомікі. Поўная нявызначанасць свабоднага часу, яго адчужанасці ад унутраных, функцыянальна-апрадмечаных сувязяў стварае высокую энтрапію і рызыку адміністратыўнага прымусу. Паніжэнне энтрапіі і рызыкі заснавана на перакражыванні працоўнага і вольнага, неабходнага і выпадковага, фармальнага і інтэлектуальнага. Перакрыжаванне двух замкненых мностваў стварае ўзаемную інфармацыю *I(A,B)*, якая вядзе да аптымізацыі сувязяў, памяншэнню хаоса і рызыкі.




$$H(A,B) = H(A) + H(B) - I(A,B).$$

Толькі штучны падзел на ўнутранае (рацыянальнае, працоўнае) і вонкавае (эфектыўнае, свабоднае) робіць адукацыю функцыянальнай часткай эканомікі. Прыцягненне адукацыі для вырашэння кадравых задач эканомікі, ператварае яе ў рэсурс, поўнасцю залежны ад амбіцый і кампетенцый бюракратыі. Працоўнае і свабоднае пры пасярэдніцтве эканомікі існуюць як два варожых пачаткі.

У адсутнасці знешніх арыенціраў, замкненая эканомікай адукацыя, выбудоўвае ўласныя (унутраныя) крытэры эфектыўнасці, накшталт, пасняховага выканання вучэбнай нагрузкі, лаяльнасці да слухачоў і г.д.. Узаконенная адукацыя дазваляе падтрымліваць калектыўную салідарнасць у межах асобнага ВНУ, факультэта, катэдры. Падставай для ўсе ўзрастаючай ролі бюракратыі трэба лічыць вялікія памеры нарміраванай калектыўнай занятасці. Замкненая адукацыя вырашае вузка-карпаратыўныя, галіновыя задачы, бо кадравая палітыка эканомікі скіравана ў бок прадпрыемстваў, тады як свабодная транспарэнтная адукацыя – стаіць на баку сям'і. Сям'я мае больш высокую ступень свабоды і адказнасці ў параўнанні з імпульсіўнай працоўнай дзейнасцю кадра. Кадравая адукацыя (гл. малюнак) штучна звужае сям'ю да ролі пастаўшчыка працоўнага рэсурса. Арыентацыя адукацыі на вырашэнне карпаратыўных задач эканомікі разбурае поле інтэлектуальнай дзейнасці выкладчыка і слухача. І выкладчык і слухач, пазбаўленыя якасных арыенціраў, пачынаюць будаваць сувязі, заснаваныя на іерархіі, рэгламентацыі правоў і абавязкаў, ператвараючы абмен інфармацыяй ў шэрую працу.



Кіраванне двума колькасцямі патрабуе цаны (каштарысаў) – рэчаў, якія нейтралізуюць сувязі, звужаюць іх актуальнасць, перспектыўнасць і якасць. Паміж звужанымі ў сваіх амбіцыях працоўнымі зонамі, узнікаць адносіны, заснаваныя на калькуляцыі і стымуляванні працоўнай дзейнасці. Колькасны сцэнар адукацыі патрабуе як мага больш работы. Работа – адзіны падмурак для атрымання выніку. Між тым, ніводзен менеджэр ад адукацыі не мае 100% упэўненасці ў прычыннай сувязі паміж занятасцю і вынікам. Нават добра кантралюемая праца ў лепшым выпадку стане на адзін ўзровень з нормай закона, не больш таго. Па сутнасці перад адэптамі эканамічнага парадку стаіць дылема: альбо пашыраць і стымуляваць функцыянальнасць замкненай адукацыі, альбо размягчыць яе іерархію сувязямі, нявызначанасцю, усім тым, што атаясамляецца з якасцю і працэсам навучання.

**2. Інтэрнэт супраць замкненасці**

Інтэрнет набывае вырашальнае значэнне ў фарміраванні транспарэнтнага інтэлектуальнага асяродзя. Паслуга, пашыраная за кошт Інтэрнэта, узвышае амбіцыі прыніжанага свабоднага часу. Інтэрнэт надае актуальнасць сям'і і, тым самым, дапаўняе працоўную канцэпцыю адукацыі значна большай ступенню свабоды. У межах дакладна вызначаных іерар-хічных сувязяў Інтэрнэт ператвараецца ў модны давесак. Шмат з навучальных устаноў маюць уласныя web-сайты, якія канцэптуальна і функцыянальна дуб-




ліруюць кадравую канцэпцыю навучання. Нічога прынцыпова новага і эфектыўнага з гэтага не атрымліваецца. Інтэрнэт не прыстасаваны для стымулявання калектыўнай працы. Перыяд куліка, які хваліць свае балота, скончыўся. Інтэрнэт, які дыстанцыруецца ад кадравай палітыкі эканомікі набывае звышфункцыянальнасць і звышпрыярытэт асобнай сям'і. Усе матэрыяльныя, фінансавыя і інтэлектуальныя патрэбы, дзякуючы пасярэдніцтву Інтэрнэта, пераразмяркоўваюцца ад прадпрыемства да сямейнага бюджэта – ісцінага карыстальніка і зацікаўленую асобу любых адукацыйных праграм. Сям'я >Інтэрнэт-партнер->навучальная установа – так можна апісаць стратэгію, якая адхіляе затратную канструкцыю навучання. Інтэрнэт можа стаць тым доўгачаканым нерэзыдэнцкім партнерам вольнаму часу. Нельга сабе ўявіць, каб нейкі крэдытор, альбо падатковая інспекцыя стала на бок сям'і і яе доўгатэрміновых неспекулятыўных планаў. Інтэрнэт можа залагініць персанальнае, стаць перашкодай на шляху масавай калектывізацыі рэсурсаў і волі.

Інтэрнэт-пераход з рацыянальна-працоўнага да эфектыўна-транспарэнтнага звужае межы замкненасці. Адукацыя набывае новую якасць:

• Прадпрыемства адукацыі губляе манаполію на працоўны рэсурс. Выкладчыкі і слухачы ствараюць адзіную інтэлектуальную Інтэрнэт-прастору, у якой працоўная занятасць есць сродак, але не мэта навучання.

• Навучальная ўстанова захавае свой уплыў выключна на матэрыяльную базу адукацыі, прапануючы не фіктыўныя стандарты занятасці, а кантракты з дакладна вызначаным узроўнем камфорта.

• Адукацыйная паслуга стане праграмай дзеянняў, прадметам дзелавых кааліцый і інтэлектуальнага сяброўства. Вызваленне прадпрыемства адукацыі ад выручкі і бюджэтных каштарысаў робіць яго маемасны комплекс адчыненым для інвестыцый і эфектыўнага супрацоўніцтва з інтэлектуальнай элітай краіны і замежжа.

Што можа зацікавіць эканоміку і прадпрыемствы адукацыі стаць транспарэнтнымі і эфектыўнымі? Відавочна, што гаспадарчая дзейнасць, заснаваная на прынцыпу "затраты-выручка" павінна звузіцца, а шмат дзе навогул знікнуць. Інтэрнэт з'яўляецца выдатнай глебай, здольнай забяспечыць эфектыўнае навучанне са зваротнай сувяззю па прынцыпу "інвестыцыя-эфектыўнасць". Інтэрнэт-інвестыцыя, скіраваная ў сям'ю, можа стаць канкурэнтным рашэннем, здольным узнагародзіць эканоміку эфектыўнымі вынікамі.


1. Бурдье П. Начала. М.: Socio-Logos, 1994.
2. Абдзіраловіч І. Адвечным шляхам: Дасьледзіны беларускага сьветагляду. Мн. Навука і тэхніка, 1993.


УДК 378

## ПРОБЛЕМА ИНТЕГРАЦИИ ИНФОРМАЦИОННЫХ И ПЕДАГОГИЧЕСКИХ ОБРАЗОВАТЕЛЬНЫХ ТЕХНОЛОГИЙ В ВУЗЕ

**Т.Е. Титовец**
*Белорусский государственный педагогический университет им. М. Танка*
*Минск, Беларусь*

*The article highlights the problem of discrepancy between advanced development of information technology and regularities of knowledge acquisition. The major issues of their fusion are put into question both at the conceptual and instrumental level of development.*

Анализ отечественного опыта разработки и использования информационных образовательных технологий в учебно-воспитательном процессе выявил наличие следующих наиболее прогрессивных моделей: мультимедийные технологии, гипертекстовые технологии, технологии виртуального моделирования и технологии дистанционного обучения.

Отметим основные достижения в разработке современных моделей информационных технологий и их интеграции с педагогическими.